*Ю.Л. КАЗАКОЎ, А.Г. КАХАНОЎСКІ, П.А. ЛОЙКА*

# АЙЧЫННАЯ ГІСТОРЫЯ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ





***Казакоў Юрый Леанідавіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, намеснік дэкана гістарычнага факультэта. Даследуе стан беларускага грамадства у канцы XVI – пачатку XVII ст., уплыў на сітуацыю канфесійнага фактару. Аўтар больш за 70 навуковых и навукова-папулярных работ па гісторыі Беларусі XVI–XX ст., у тым ліку дзвюх манаграфій і сямі навучальных дапаможнікаў.

***Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу, намеснік дэкана гістарычнага факультэта. Даследуе пытанні сацыяльнай і культурна-палітычнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX ст. Аўтар больш за 60 навуковых і навукова-метадычных работ па гісторыі Беларусі XIX ст., у тым ліку каля дзесятка навучальных дапаможнікаў.

***Лойка Павел Алегавіч*** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Кола яго навуковых інтарэсаў ахоплівае праблемы сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай гісторыі ВКЛ XVI–XVIII ст. Аўтар больш за 120 навуковых і навукова-папулярных публікацый.

The article contains the retrospective analysis of the Belarusian history problems research carried out by the specialists of the historical faculty, the Belarusian State University. The primary attention is paid to the themes of the researches, their changes, evolution of scientific approaches and main achievements.

Гісторыя – настаўніца жыцця. Так пісалі яшчэ ў старажытнасці, і гэта ісціна добра ўсведамлялася нашым грамадствам у пачатку 1920-х гг., калі ствараўся і рабіў першыя крокі Беларускі дзяржаўны універсітэт. Дзякуючы намаганням яго першага рэктара прафесара У.І. Пічэты ва універсітэцкай адукацыі пачэснае месца занялі такія дысцыпліны, як гісторыя Беларусі, гісторыя народнай гаспадаркі БССР, гісторыя рускага і беларускага права. У цэнтры гэтай працы, акрамя рэктара, стаялі М.В. Доўнар-Запольскі, У.М. Ігнатоўскі, Ф.Ф. Турук, Д.А. Дудкоў, К.І. Кернажыцкі, В.Д. Дружчыц, М.М. Шчакаціхін, пра якіх з цеплынёй і ўдзячнасцю ўспаміналі першыя студэнты сацыяльна-гістарычнага аддзялення педфака.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Пасля стварэння ў 1934 г. асобнага гістарычнага факультэта з адзінай кафедры ўсеагульнай гісторыі ў 1936 г. вылучылася кафедра гісторыі СССР і БССР, на якой працавалі А.П. П'янкоў, Д.А. Дудкоў, Ц.С. Гарбуноў. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, у 1940 г. была створана першая універсітэцкая праграма курса "Гісторыя Беларусі", выкладчыкі прынялі ўдзел у падрыхтоўцы дапаможніка "Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах". У 1939 г. на гістфаку адбылася абарона першай кандыдацкай дысертацыі. У пасляваенныя гады айчынная гісторыя развівалася і заняла пэўнае месца ў сістэме універсітэцкай адукацыі. У лістападзе 1958 г. пад кіраўніцтвам Л.С. Абэцэдарскага была створана кафедра гісторыі БССР, якую пасля 1957 г. узначальвалі дактары гістарычных навук, прафесары В.У. Чапко, І.О. Царук, А.П. Ігнаценка.

У чэрвені 1994 г. у сувязі з пашырэннем і паглыбленнем вывучэння курса айчыннай гісторыі як на гістарычным, так і на іншых факультэтах Белдзяржуніверсітэта кафедра падзялілася на дзве: кафедру гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў (загадчык П.А. Лойка) і кафедру гісторыі Беларусі новага і навейшага часу (загадчык П.І. Брыгадзін, з 1999 г. загадчык А.Г. Каханоўскі).

Асновы для вывучэння шматлікіх праблем мінуўшчыны Беларусі – грамадска-палітычнай гісторыі, царкоўна-рэлігійнай эвалюцыі, аграрнай гісторыі, развіцця гарадоў, культурнага жыцця – закпаў патрыярх беларускай гістарычнай школы акадэмік У.І. Пічэта. У дакументальнай працы "Аграрная рэформа Жыгімонта-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве"[1] знакаміты медыявіст усебакова разгледзеў прычыны правядзення і вынікі гаспадарчых пераўтварэнняў, вызначальных для беларускай вёскі і эканомікі Вялікага княства Літоўскага ў цэлым. Навуковыя публікацыі У.І. Пічэты 1919–1930-х гг. былі прысвечаны разгляду становішча асобных катэгорый сялянства ў XV–XVI ст., юрыдычнага статуса сельскага насельніцтва, эвалюцыі феадальнага землеўладання, стану паместнай гаспадаркі. Вучоны надаў увагу такім праблемам палітычнай гісторыі ВКЛ, як шляхі ўваходжання беларускіх зямель у скпад княства Літоўскага, дзяржаўны лад краіны, уніі ВКЛ з Каронай Польскай, дыпламатычныя адносіны з суседзямі. Значны ўклад У.І. Пічэта ўнёс у распрацоўку "Скарыніяны". Грунтоўныя даследаванні класіка айчыннай гістарычнай навукі аб'яднаны ў маскоўскім выданні пад назвай "Беларусь і Літва XV–XVI ст."[2]

Вучні У.І. Пічэты ў 1919–1930-я гг. працягнулі шматаспектнае вывучэнне праблем сярэдневяковай гісторыі Беларусі. Аб'ёмны артыкул Т.І. Забелы, у якім аўтар абапіраўся на дадзеныя прыкпады соцень інвентароў феадальных уладанняў, вывучаў стан панскай і сельскай гаспадарак на беларускіх землях у другой палове XVIII ст.[3] Працы К.І. Кернажыцкага былі прысвечаны характарыстыцы фальварачнай і сельскай гаспадарак у дзяржаўных уладаннях на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.[4] Аўтар упершыню ў беларускай гістарычный навуцы ўвёў статыстычны метад апрацоўкі дакументальных крыніц па аграрнай гісторыі.

Праблемы самакіравання ў беларускім сярэднявечным горадзе аналізаваў прафесар гісторыі БДУ В.Д. Дружчыц[5], які, працягваючы даследаванні свайго настаўніка У.І. Пічэты, разглядаў становішча ВКЛ у скпадзе Рэчы Паспалітай у паслялюблінскі перыяд. Аналіз тэксту статута ВКЛ 1588 г. і факты палітычнага жыцця апошняй трэці XVI ст. схілілі медыявіста да высновы, што ў пабудове агульнай польска-велікакняжацкай дзяржавы дакладна паўставалі ўсе элементы дуалізму на федэратыўных асновах[6]. Пасляваенную беларускую гістарыяграфію па сярэднявечнаму перыяду можна вызначыць як "гарадошную". Даследаванні беларускіх гарадоў будаваліся як на археалагічных дадзеных, так і на пісьмовых крыніцах. Вывучэнню ра-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

месніцкай вытворчасці ў гарадах Беларусі XVII–XVIII ст. прысвяціў сваю працу вядомы гісторык А.П. Ігнаценка[8]. Значная ўвага ў гістарыяграфіі 1950–1970-х гг. адводзілася вывучэнню беларуска-расійскіх адносін у XVI–XVIII ст. Шэраг работ па гэтай складанай праблеме падрыхтаваў і апублікаваў знакаміты прафесар БДУ Л.С. Абэцэдарскі. Пільная ўвага ў яго працах адводзілася антыфеадальным выступленням на беларускіх землях у сярэдзіне XVII ст.[9] Таксама былі разгледжаны беларуска-рускія эканамічныя і культурныя сувязі[10]. Безумоўна, цікавымі і навацыйнымі сюжэтамі ў беларускай гістарыяграфіі было вывучэнне рассялення беларусаў у расійскай дзяржаве, іх занятке на новым месцы пражывання, вынікі вытворчай і культурнай дзейнасці. Тэматычна ў працяг даследчыцкай працы Л.С. Абэцэдарскага прафесар А.П. Ігнаценка падрыхтаваў манаграфію[11], у якой на фоне сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай другой паловы XVII–XVIII ст. разглядзеў настроі і захады насельніцтва да ўз'яднання з усходнім расійскім суседам. Даследчык закрануў пытанні, што былі абыдзены папярэднікамі: народны рух на поўдні Беларусі ў перыяд Каліўшчыны на Украіне, адносіны беларускіх сялян і мяшчан да падзелаў Рэчы Паспалітай і вызваленчага руху 1794 г.

Адзначым, што ў вышэйназваных працах мелі адчувальны ўплыў канцэптуальна-метадалагічныя палажэнні, якія былі закладзены ў "Тэзісах аб асноўных пытаннях гісторыі БССР" (ч. 1, 1948), згодна з якімі гісторыя беларусаў зводзілася да "імкнення народных мас Беларусі да Маскоўскай дзяржавы". Гіпертрафіраваны класавы падыход практычна выключаў магчымасць з'яўлення ў беларускай гістарыяграфіі 1950–1980-х гг. грунтоўных прац па гісторыі дзяржавы і права, шляхецкага саслоўя, царкоўна-рэлігійнай тэматыцы.

У 1980-я гг. працягваліся даследаванні па ідэалагічна бяспечнай сацыяльна-эканамічнай праблематыцы. Так, на пытаннях эвалюцыі феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст. у прыватнаўласніцкіх маёнтках, у тым ліку дробнай і сярэдняй шляхты, канцэнтраваў сваю ўвагу П.А. Лойка[12]. У яго манаграфіі, якая базіруецца на вывучэнні 451 інвентарнага апісання па 220 уладаннях на ўсёй тэрыторыі Беларусі, ва ўсёй шматскладанасці паказаны працэс фарміравання сістэмы рэнтных адносін як вынік шэрага сацыяльна-эканамічных і палітычных абставін, характэрных для Беларусі XVI–XVIII ст.

У 1990-я гг. XX – пачатку XXI ст. навукоўцы звярнуліся да актуальных, але нявывучаных праблем грамадска-палітычнай, ваеннай, канфесійнай гісторыі. Так, у 1991 г. з'яўляюцца публікацыі Ю.І. Драгуна аб месцы уніяцкай царквы ў лёсе беларускага народа[13]. У 1994 г. выходзіць манаграфія У.П. Емельянчыка, у якой панарамна разгортваюцца падзеі паўстання 1794 г. на землях Беларусі. На сучасны момант распрацоўваюцца праблемы палітычнай актыўнасці шляхты беларускіх зямель у XVI–XVII ст.[15], уплыву канфесійных супярэчнасцей на стан беларускага грамадства ў эпоху сярэднявечча[16]. У перспектыўным арсенале універсітэцкіх навукоўцаў, якія даследуюць гісторыю Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, шмат задум па ліквідацыі значных лакун нашай мінуўшчыны, па інфармаванню сусветнай грамадскасці пра ўсё багацце беларускай гісторыі.

Айчыннымі навукоўцамі надавалася параўнальна няшмат увагі вывучэнню гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. на розных этапах. Невялікае кола пытанняў знайшло здавальняючае адлюстраванне ў літаратуры. Толькі ў апошняе дзесяцігоддзе назіраецца пашырэнне тэматыкі, разнастайнасці падыходаў у вывучэнні абазначанага перыяду. Выкладчыкі універсітэта ў 1920–1930-х гг. звярнулі ўвагу перш за ўсё на пытанні, звязаныя з сацыяльнымі працэсамі напярэдадні і ў час рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. і



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

1917 г. (У.І. Пічэта, У.М. Ігнатоўскі і інш.), сацыяльна-эканамічным развіццём Беларусі, гісторыяй сялянства, пралетарыяту, і іншыя (М.В. Доўнар-Запольскі, В.К. Шчарбакоў і інш.)[17]. Найбольш сур'ёзным даследаваннем у гэты час па гісторыі Беларусі стала манаграфія М.В. Доўнар-Запольскага[18], у якой змешчаны вялікі фактычы матэрыял. Аўтар насуперак меркаванням сучаснікаў і паслядоўнікаў звязваў пачатковы этап капіталістычнай мадэрнізацыі Беларусі з 80-мі гадамі XIX ст. У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі тэматыка вывучэння гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. практычна не змянілася. На першым плане разглядаліся падзеі рэвалюцыі 1905–1907 гг.[19], на другім – характарызаваліся феадальна-прыгонніцкія адносіны, правядзенне рэформы 1861 г.[20]. гісторыя грамадскага руху на Беларусі ў XIX ст. і інш.[21]

У 1960–1980-я гг. выкладчыкі гістарычнага факультэта апублікавалі шэраг грунтоўных прац па айчыннай гісторыі, якія не страцілі сваёй вартасці ў сувязі са зменамі канцэптуальных падыходаў у вывучэнні гісторыі. Праблемы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў першай палове XIX ст. (стан памешчыцкай гаспадаркі, становішча сялянства, яго рух і інш.) разглядаліся ў манаграфіях і артыкулах В.У. Чапко[22]. Гісторыі фарміравання чыгуначнага пралетарыяту прысвечаны працы В.А. Цітка[23]; пытанні развіцця гістарычнай думкі і грамадскага жыцця ў Беларусі XIX ст. прааналізаваў у навуковых працах Ю.І. Драгун[24].

Сённяшні этап вывучэння гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст. у значнай ступені вызначаецца працамі выкладчыкаў кафедры гісторыі Беларусі, а пасля яе рэарганізацыі ў 1994 г. – кафедры гісторыі новага і навейшага часу. Гісторыі партыі эсэраў і яе дзейнасці на Беларусі, пытанням грамадскага жыцця ў пачатку XX ст. прысвечаны работы П.І. Брыгадзіна[25]. Шмат гадоў эвалюцыю дзяржаўных уладанняў, сацыяльнай групы дзяржаўных сялян у Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. плённа вывучае У.А. Сосна[26]. Шырокі спектр пытанняў урадавай палітыкі на Беларусі, грамадскага і канфесійнага жыцця ў XIX ст. сталі прадметам глыбокага даследавання ў працах В.А. Цяпловай[27]. Сацыяльная структура і стратыфікацыя беларускага грамадства, эвалюцыя ліберальнага руху і ідэалогіі ў Беларусі ў другой палове XIX ст. складаюць сферу навуковых даследаванняў А.Г. Каха/оўскага[28]. Шмат гадоў свайго жыцця аддаў вывучэнню гісторыі Беларусі XIX ст. В.С. Касмылёў[29].

Гісторыя Беларусі XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца аб'ектам увагі некаторых выкладчыкаў кафедры гісторыі Расіі (гісторыя дваранства – С.Л. Лугаўцова), гісторыі паўднёвых і заходніх славян (гісторыя культуры – В.А. Сімакова), этналогіі, музеязнаўства і гісторыі мастацтваў (этнічныя працы – П.У. Церашковіч; гісторыя музейнай справы – А.А. Гужалоўскага; паўстанне 1830–1831 гг. – В.В. Гарбачова)[30].

Апошнім часам назіраецца тэндэнцыя звароту да новай ці маларапрацаванай тэматыкі гісторыі Беларусі XIX – пачатку XX ст., пераасэнсавання з улікам новых падыходаў традыцыйных праблем айчыннай гісторыі: сацыяльная стратыфікацыя, мадэрнізацыйныя працэсы ў Беларусі (А.Г. Кахаyоўскі), урадавая палітыка (В.А. Цяплова), вайна 1812 г. і Беларусь (А.М. Лукашэвіч), чыноўніцкі апарат на Беларусі (Н.А. Роцька).

З моманту заснавання універсітэта навукоўцы надавалі пэўную ўвагу праблемам айчыннай гісторыі падчас і пасля 1917 г. Пачынальнікам гэтай справы трэба лічыць члена праўлення прафесара БДУ У.М. Ігнатоўскага, які ў 1920-я гг. падрыхтаваў звыш 30 навуковых работ, распрацаваў канцэпцыю нацыянальнай гісторыі[31]. Да гонару даследчыка трэба аднесці эканамічнае і палітычнае абгрунтаванне нацыянальна-вызваленчага руху за адраджэнне мовы, культуры, самасвядомасці і дзяржаўнасці беларускага народа. Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая вырашыла сацыяльныя пытанні, закранула і праблемы нацыянальныя, спрыяла абвяшчэнню БССР.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У 1930-я гг. з'яўляецца шэраг навуковых і папулярных прац Ц.С. Гарбунова, Д.А. Дудкова[32], якія былі прысвечаны праблемам нацыянальнага руху, утварэнню БССР, уз'яднанню Заходняй Беларусі з Усходняй. Напісаныя з марксісцка-ленінскіх пазіцый і ў неспрыяльны час, яны перабольшвалі значэнне рэвалюцыйнай і класавай барацьбы, давалі адмоўную характарыстыку нацыянальнаму руху.

Актыўная распрацоўка праблем савецкай гісторыі ва універсітэце адбывалася ў другой палове 1940-х – першай палове 1980-х гг. Значна ўзрасла колькасць даследаванняў, у навуковае карыстанне было ўведзена шмат новых архіўных матэрыялаў. Гісторыкі засяродзілі ўвагу на падзеях Кастрычніка на Беларусі, і ў першыя пасляваенныя гады з'явіліся працы Н.В. Каменскай, У.Р. Івашына, І.М. Ігнаценкі[33], дзе разглядаліся грамадска-палітычныя адносіны, праблемы такгыкі палітычных партый у барацьбе за масы, дзейнасць бальшавікоў. Сярод іх змястоўнасцю класавых характарыстык пралетарыяту і сялянства вылучаецца манаграфія І.М. Ігнаценкі[34], у якой упершыню адлюстраваўся ўплыў на сялянства нацыянальных партый, аналізаваўся склад і работа І Усебеларускага з'езда. Становішчу беларускай вёскі і палітыцы бальшавікоў у адносінах да сялянства былі прысвечаны навуковыя працы Д.П. Жмуроўскага[35]. Гісторыкаў хвалявала праблема ўтварэння БССР і вызначэння асноўных характарыстык палітыкі бальшавікоў у нацыянальным пытанні, у сувязі з чым з'явіліся даследаванні Н.В. Каменскай, Я.Ю. Несцяровіча, М.Е. Шкляра[36]. І хаця на гэтых даследаваннях адбіліся спрошчаныя падыходы, заідэалагізаваныя адзнакі, яны значна прасоўвалі наперад распрацоўку пытанняў рэалізацыі нацыянальнай ідэі і стварэння беларускай дзяржаўнасці.

У пасляваенны час гісторыкі універсітэта надалі пэўную ўвагу аналізу падзей на Беларусі ў часы НЭПа і сацыялістычнага будаўніцтва. У працах С.Г. Скабцова, М.Е. Шкпяра[37] ўздымаліся пытанні рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі на вёсцы. Г.Г. Герасіменка і У.Н. Сідарцоў[38] актыўна распрацоўвалі праблему далучэння працоўных да кіраўніцтва дзяржавай. Пакуль яшчэ са старых пазіцый, але на вялікім фактычным матэрыяле пачала вывучацца гісторыя індустрыялізацыі і калектывізацыі, сведчаннем чаму сталі артыкулы і кнігі С.Г. Скабцова, А.І. Сідарэнкі, К.К. Германа, В.Ф. Працко, І.Ф. Літвіноўскага, В.І. Медзяніка і інш.[39] Значная група універсітэцкіх даследчыкаў засяродзіла ўвагу на пытаннях развіцця нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі і палітыкі савецкіх улад у дачыненні да гэтага рэгіёну пасля яе ўз'яднання. Асабліва плённа ў гэтым накірунку працавалі П.З. Савачкін, І.О. Царук, А.У. Царук, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі і інш[40]. А.А. Тозік прыступіў да аналізу падзей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і падрыхтаваў грунтоўную манаграфію, прысвечаную стварэнню падполля[41].

Па меры назапашвання фактычнага матэрыялу і яго абагульнення гісторыкі універсітэта прыступілі да распрацоўкі праблем пасляваеннай гісторыі Беларусі. Шмат артыкулаў і навуковых прац было прысвечана гісторыі рабочага класа і сялянства. Гэтай праблематыкай актыўна займаліся Л.А. Міхайлоўскі, У.К. Коршук, Ю.Л. Казакоў, А.П. Салькоў, В.В. Брыгадзіна, Л.А. Жылуновіч, А.М. Алпееў і інш[42]. Шэраг навуковых прац (манаграфіі У.Е. Снапкоўскага[43]) былі прысвечаны міжнароднай дзейнасці. З'явіліся працы па актуальных праблемах гісторыі культуры. У кнігах І.М. Ільюшына, С.А. Умрэйкі, М.І. Красоўскага[44] раскрываліся пытанні развіцця народнай адукацыі. Група даследчыкаў, у якую ўваходзілі А.І. Кажушкоў, А.А. Яноўскі, М.Ф. Чудаеў, прыступіла да распрацоўкі гісторыі універсітэта і на працягу 1960–1980-х гг. падрыхтавала шмат цікавых выданняў. З удзелам універсітэцкіх даследчыкаў у пасляваенны перыяд з'явіліся першыя абагульняючыя працы па айчыннай гісторыі. У 1958 г. выйшаў у свет другі том двухтомнага



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

выдання "Гісторыя Беларускай ССР", у якім упершыню была сістэматызавана гісторыя беларускага народа за гады Савецкай улады. У 1972–1975 гг. з'явіліся апошнія тры тамы пяцітомнага выдання "Гісторыя Беларускай ССР", якія цалкам прысвячаліся вызначанаму перыяду. Сярод найбольш характэрных момантаў адлюстравання развіцця айчыннай гісторыі ў Белдзяржуніверсітэце ў 1940–1980-я гг. трэба адзначыць захаванне старых метадалагічных падыходаў, слабае асвятленне негатыўных з'яў жыцця грамадства.

Якасна новы этап у гістарыяграфіі савецкага перыяду пачынаецца ў другой палове 1980-х гг. У выніку радыкальных сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў была ліквідавана манаполія марксісцка-ленінскай метадалогіі, большасць навукоўцаў актыўна ўключылася ў работу над пераасэнсаваннем мінулага. У 1991 г. выйшаў у свет зборнік "Актуальныя пытанні гісторыі БССР", у якім гісторыкі універсітэта выказалі новы погляд на савецкі перыяд. Пачалося пераасэнсаванне нацыянальна-вызваленчага руху, ролі БНР, дзейнасці Беларускай сацыялістычнай грамады, Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў у стварэнні нацыянальнай дзяржаўнасці (манаграфіі П.І. Брыгадзіна, У.К. Коршука, І.Ф. Раманоўскага, У.Ф. Ладысева[45].

Новыя падыходы вызначыліся ў асэнсаванні сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР у міжваенны перыяд (1919–1939 гг.), сведчаннем чаму сталі распрацоўкі С.М. Ходзіна, У.Ф. Ладысева, Л.М. Хухлындзінай, П.І. Зялінскага[46]. Праблемам стварэння на Беларусі таталітарнай сістэмы і разгортвання палітычных рэпрэсій прысвяцілі свае даследаванні У.І. Адамушка і В.І. Мянькоўскі[47]. Універсітэцкія гісторыкі пачалі пераглядаць старонкі пасляваеннага жыцця, закранаць і сучасныя праблемы. Вялікімі намаганнямі перш за ўсё У.Н. Сідарцова, А.А. Яноўскага, А.Г. Каханоўскага, Ю.Л. Казакова, С.М. Ходзіна і іншых у 1990-я гг. для сярэдняй школы былі падрыхтаваны падручнікі і дапаможнікі па айчыннай гісторыі савецкага перыяду.

Сустракаючы 80-годдзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта, супрацоўнікі дзвюх гістарычных кафедр вядуць актыўны навуковы пошук па ўсіх напрамках. Вынікам іх даследаванняў ужо ў бліжэйшы час стануць новыя манаграфіі, артыкулы і падручнікі па гісторыі Беларусі.

[1] Гл.: Пичета В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве: В 2 ч. М., 1958. Ч. 1, 2.

[2] Гл.: Пичета В.И. Белоруссия и Литва XV–XVI вв. М., 1961.

[3] Гл.: Забела Т.І. Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII ст. // Зап. Аддзелу гуманітарных навук: У кн. 3. Працы клясы гісторыі. Мн., 1928. Т. 2.

[4] Гл.: Кернажыцкі К.І. Гаспадарка старостваў на Беларусі і эканамічны стан іх насельніцтва ў другой палове XVIII ст. // Там жа; Ён жа. Гаспадарка прыгоннікаў на Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX ст. (да праблемы разлажэння феадалізму ў Беларусі). Мн., 1935.

[5] Гл.: Дружчыц В.Д. Месца Менск у канцы XV і пачатку XVI ст. // Працы БДУ. 1926. № 12; Ён жа. Беларускія месты ў гістарычный літаратуры // Гістарычна-археалагічны зборнік. Мн., 1927.

[6] Гл.: Дружчыц В.Д. Палажэнне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасля Люблінскай вуніі // Працы БДУ. 1925. № 6–7.

[7] Гл.: Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Мн., 1982.

[8] Гл.: Игнатенко А.П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII–XVIII вв. Мн., 1963.

[9] Гл.: Абэцэдарскі Л.С. Барацьба ўкраінскага і беларускага народаў за ўз'яднанне з Расіяй у сярэдзіне XVII ст. Мн., 1954.

[10] Гл.: Абецедарский Л.С. Белорусы в Москве XVII в. Мн., 1957; Он же. Белоруссия и Россия. Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII вв. Мн., 1978.

[11] Гл.: Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией (вторая половина XVII–XVIII вв.). Мн., 1974.

[12] Гл.: Лойка П.А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVI–XVIII ст. Мн., 1991.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[13] Гл.: Драгун Ю.І. Уніяцкая царква і дзяржаўная палітыка // З гісторыяй на Вы. Мн., 1991.

[14] Гл.: Емельянчык У. Паланез для касінераў. З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі. Мн., 1994.

[15] Гл.: Лойка П.А. Сфера палітычных інтарэсаў шляхты беларускіх зямель у апошняй трэці XVI – першай трэці XVII ст. // Веснік БДУ. Сер. 3. 2000. № 1.

[16] Гл.: Казакоў Ю.Л. Пацыфізм беларускіх арыян у 70–80-х гадах XVI ст. // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця. Мн., 1999.

[17] Гл.: Пічэта У.І. Класавыя супярэчнасці ў Беларусі напярэдадні рэвалюцыі // Беларусь. Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. Мн., 1924; Он же. Крестьянское и рабочее движение на Белоруссии в эпоху 1905 г. // Працы БДУ у Мінску. 1926. № 11. С. 105–127; Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX стагоддзя. Мн., 1928; Шчарбакоў У. Нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1931.

[18] Гл.: Довнар-Запольский М.В. Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. Мн., 1926.

[19] Гл.: Каменская Н.В. Первая русская революция 1905–1907 гг. и революционное движение в Белоруссии // Бальшавік Беларусі. 1950. № 24. С. 45–54; Воранава А.І. Рэвалюцыйны рух у Беларусі падчас першай буржуазнай дэмакратычнай рэвалюцыі 1905–1907 гг. // Сборник научных работ Минского педагогического института. Мн., 1952; Мельцер М.Д. К истории возникновения социально-демократических организаций в Белоруссии // Ученые записки БГУ. Сер. истории. Мн., 1953. Вып. 16.

[20] Гл.: Пьянков А.П., Корнейчик Е.И., Фридман М.Б. Белоруссия в период разложения феодально-крепостнического строя и зарождения капиталистических отношений (конец XVIII – первая половина XIX в.) // Ученые записки БГУ. Сер. истории. Мн., 1954. Вып. 17.; Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958; Кожушков А.И. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии второй половины XIX в. Мн., 1963.

[21] Гл.: Чапко В.У. 1848 г. у Беларусі // Беларусь. 1958. № 1; Перцаў У.М. Гістарычная думка на Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1957. № 2.

[22] Гл.: Чепко В.В. Сельское хозяйство Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1966; Он же. Классовая борьба в белорусской деревне в первой половине XIX в. Мн., 1972; Он же. Разложение феодально-крепостнической системы и формирование капиталистических отношений в сельском хозяйстве Белоруссии в первой половине XIX в. Мн., 1965; Он же. Города Белоруссии в первой половине XIX в. (экономическое развитие). Мн., 1981.

[23] Гл.: Титок В.А. Формирование и революционная борьба железнодорожного пролетариата Белоруссии во второй половине XIX – начале XX в. Мн., 1966.

[24] Гл.: Драгун Ю.И. Историография истории БССР с древнейших времен до Великой Октябрьской социалистической революции. Мн., 1980; Драгун Ю.И. Адам Киркор. Белорусский историк // Политическая мысль в России в XIX в. Йена, 1990. Т. 1, 2.

[25] Гл.: Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.) Мн., 1994; Бригадин П.И., Кохановский А.Г. Социальная структура белорусского общества на рубеже XIX – XX вв. // Весн. БДУ. Сер. 3. 1996. № 3.

[26] Гл.: Сосно В.А. Скпадывание сословия государственных крестьян в Белоруссии в конце XVII – первой четверти XIX в. // Вопросы истории. Мн., 1981. Вып. 8; Сосна У.А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мн., 2000.

[27] Гл.: Теплова В.А. Польский вопрос и национально-религиозная политика в Белоруссии (конец XVIII – первая половина XIX в.) // Тэзісы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 1000-годдзю Полацкай епархіі. Мн., 1992; Она же. Ш.-Г. Монтескье и зарождение идеологии либерализма в Белоруссии (конец XVIII – начало XIX века) // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000.

[28] Гл.: КахаНоўскі Г.А., Каханоўскі А.Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. Мн., 1992; Каханоўскі А.Г. Сацыяльныя перадумовы і асаблівасці пашырэння лібералізму на Беларусі ў другой палове XIX ст. // Гістарычная навука ў Белдзяржуніверсітэце на рубяжы тысячагоддзяў. Мн., 2000.

[29] Гл.: Касмылёў В.С., Стуканаў А.А. Эмблематыка нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі (пачатак 60-х гадоў XIX ст.) // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя падыходы: новыя канцэпцыі): Тэзісы дакладаў і паведамленняў Усебеларускай канферэнцыі, Мінск, 3–5 лютага 1993 г.: У 2 ч. Мн., 1993. Ч. 1.

[30] Гл.: Церашковіч П.У., Чаквін І.У. Беларусы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т. 1; Симакова О.А. Русский театр в Белоруссии в начале XX в. // Вопросы истории. Мн., 1984. Вып. 11; Гужалоўскі А.А. Нараджэнне беларускага музея. Мн., 2001.

[31] Гл.: Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1919; Ён жа. Кароткі нарыс нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі. Мн., 1921.

[32] Гл.: Горбунов Т.С. Советская Белоруссия. Мн., 1938; Освобожденная Западная Белоруссия. М., 1940; Дудкоў Д.А. Контррэвалюцыйны беларускі нацыянал-дэмакратызм на службе ў белапольскіх акупантаў // Бальшавік Беларусі. 1935. № 10-11.

[33] Гл.: Каменская Н.В. Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя і ўтварэнне БССР. Мн., 1954; Он же. Першая рэвалюцыя І ўтварэнне БССР. Мн., 1954; Он же. Первые социалистические преобразования в Белоруссии (25 октября 1917 – июль 1919 гг.). Мн., 1957;



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Он же. Белорусский народ в борьбе за Советскую власть (1919–1920); Ивашин В.Г. Великий Октябрь в Минске. Мн., 1957; Он же. Борьба большевиков Белоруссии против корниловщины. Мн., 1962; Он же. Большевики Белоруссии и Западного фронта в борьбе за осуществление Ленинского декрета о мире. Мн., 1972.

[34] Гл.: Игнатенко И.М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917–1918 гг.). Мн., 1962.

[35] Гл.: Жмуровский Д.П. Организационная работа коммунистической партии в деревне (1918–1920 гг.). Мн., 1970; Он же. Республика Советов – единство фронта и тыла (1918–1920 гг.). Мн., 1980; Он же. В борьбе за Советскую власть: Деятельность большевиков в белорусской деревне (1918–1920 гг.). Мн., 1989.

[36] Гл.: Каменская Н.В. Утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Мн., 1946; Нестерович Я.Ю. За союз нерушимых республик свободных. Объединительное движение трудящихся Белоруссии. Мн., 1981; Шкляр М.Е. Белорусская ССР – одна из учредительниц Союза ССР. Мн., 1972.

[37] Гл.: Скобцов С.Г. Организация крестьянских комитетов общественной взаимопомощи БССР (1921–1922 гг.) // Ученые записки БГУ. Сер. истории. Мн., 1955. Вып. 22; Шкляр М.Е. Борьба компартии Белоруссии за укрепление союза рабочего класса и трудящегося крестьянства в восстановительный период (1921–1925 гг.). Мн., 1960.

[38] Гл.: Герасименко Г.Г. Работа КПБ по вовлечению трудящихся масс в управление государством в годы первой пятилетки (1928–1932 гг.). Мн., 1962; Он же. Деятельность компартии Белоруссии по вовлечению трудящихся масс в управление государством (1925–1937 гг.). Мн., 1973; Сидорцов В.Н. Государственная деятельность рабочего класса БССР (1921–1937 гг.). Мн., 1978; Он же. Ведущая роль рабочего класса в управлении государством в период строительства социализма (на материалах Белорусской ССР). Мн., 1980.

[39] Гл.: Скобцов С.Г. Кресткомы БССР в борьбе с кулачеством в 1932–1934 гг. Мн., 1961; Герман К.К. Ведущая роль рабочего класса в создании колхозного строя в Белоруссии (1926–1935 гг.). Мн., 1968. Он же. Двадцатипятитысячники Белоруссии. Мн., 1971.

[40] Гл.: Савочкин П.З. Борьба рабочего класса Западной Белоруссии в 1921–1925 гг. за воссоединение в едином социалистическом государстве. Мн., 1955; Он же. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за Советы в 1918–1919 гг. Мн., 1966; Царюк И.О. КПБ – организатор культурного строительства в западных областях республики. Мн., 1969; Ладысев В.Ф. КПЗБ – организатор борьбы трудящихся за демократические права и свободы (1934–1938 гг.). Мн., 1976; Он же. Вопреки воле народа. Мн., 1976; Он же. Путь к свободе: Из истории революционно-освободительного движения в Западной Белоруссии в 1919–1939 гг. Мн., 1978; Зелинский П.И. Печать КПЗБ в борьбе за свободу (в соавторстве). Мн., 1977.

[41] Гл.: Тозик А.А. В дни суровых испытаний: Укрепление рядов КП(б)Б в условиях подполья в годы Великой Отечественной войны (1941–1944). Мн., 1981.

[42] Гл.: Михайловский Л.М. Развитие промышленности Минска в годы четвертой пятилетки. Мн., 1962; Коршук В.К. Рост трудовой активности рабочего класса. Мн., 1976; Коршук В.К., Казаков Ю.Л. и др. Во имя великой цели. Мн., 1981.

[43] Гл.: Снапковский В.Е. Путь Белоруссии в ООН (1944–1945). Мн., 1983; Он же. Участие Белорусской ССР во внешнеполитической деятельности СССР // В борьбе за мир и безопасность народов (в соавторстве). М., 1984; Он же. Белорусская ССР в ООН (1945–1985). Мн., 1985.

[44] Гл.: Ильюшин И.М., Умрейко С.А. Народное образование в Белорусской ССР. Мн., 1961; Красовкий Н.И. Высшая школа Советской Белоруссии. Мн., 1972; Кожушков А.И. Белорусский государственный университет им. В.И. Ленина. Мн., 1971; Он же. Белорусский государственный университет. Мн., 1980.

[45] Гл.: Бригадин П.И. Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.). Мн., 1994; Коршук В.К., Романовский И.Ф. и др. Государственность Беларуси: Проблема формирования в программах политических партий. Мн., 1999; Ладысеў У.Ф., Брыгадзін П.І. На пераломе эпох: станаўленне беларускай дзяржаўнасці (1917–1920 гг.). Мн., 1999.

[46] Гл.: Ходзін С.М. Арганізацыя перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў калектыўных гаспадарках БССР (другая палова 20-х гадоў) // Веснік БДУ. Сер. 3. 1990. № 3; Хухлындина Л.М., Зелинский П.И. История коллективизации в СССР. Мн., 1990; Ладысев В.Ф. В борьбе за демократические права и свободы. Мн., 1988.

[47] Гл.: Адамушко У.І. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. Мн., 1994; Меньковский В.И. Противоречивость социально-политического развития советского общества в годы первых пятилеток (1928–1937 гг.). Мн., 1990.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm